Наталля Карнейчук



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# XXX РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ» ЗАВЕРШАНЫ: ЧАС ПАДВЕСЦІ ВЫНІКІ

Вольга Какшынская



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

13 мая 2022 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) у анлайн-рэжыме былі падведзены вынікі XXX юбілейнага Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2021 г.

Конкурс праводзіцца сярод публічных бібліятэк Беларусі ў 2 этапы (абласны і рэспубліканскі) па 4 намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы».

Сёлета за званне лепшых змагаліся 36 публічных бібліятэк: 16 цэнтральных бібліятэк і 20 бібліятэк-філіялаў, у тым ліку 5 дзіцячых бібліятэк, 14 гарпасялковых і сельскіх.

У склад кампетэнтнага журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска.

Спачатку пераможцаў вызначылі па абласцях і толькі пасля конкурсныя работы ацаніла рэспубліканскае журы. Вызначэнне пераможцаў конкурсу адбывалася з дапамогай пісьмовага галасавання членаў журы. У мэтах атрымання аб'ектыўнай адзнакі члены журы не ацэньвалі матэрыялы сваёй вобласці.

Усе конкурсныя работы выкананы на высокім інфарматыўным і афарміцельскім ўзроўнях, і практычна кожная змяшчае ўласныя распрацоўкі (праграмы, праекты, спасылкі на электронныя рэсурсы асабістай генерацыі), рэкламную і інфармацыйную прадукцыю; суправаджаецца відэаматэрыяламі, прэзентацыямі, гульнёвымі праграмамі, сцэнарыямі і г. д.

Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеней былі адзначаны 22 публічныя бібліятэкі, 5 бібліятэк прадстаўлены да заахвочвання. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 123 ад 13 чэрвеня 2022 г. «Аб выніках XXX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Бібліятэкі-дыпламанты першай, другой і трэцяй ступеней атрымаюць грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна; бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання – 10 базавых велічынь.

Паведамім пра асноўныя дасягненні бібліятэк-пераможцаў, якія атрымалі дыпломы першай ступені ў кожнай намінацыі. Даведацца аб усіх пераможцах конкурсу можна на партале НББ (https://www.nlb.by).

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена ў намінацыі **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** – 11 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *дзяржаўнай установе культуры «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы» Мінскай вобласці* за распрацоўку і рэалізацыю праекта «Парады з вуснаў несвіжан». Праект ажыццяўляўся сумесна з раённай газетай «Нясвіжскія навіны», праграмай радыёвяшчання «Раніца Нясвіжчыны», дзяржаўнай установай адукацыі «Сярэдняя школа № 4 г. Нясвіжа» і наведвальнікамі гуртка «Юны журналіст». Ён дапамагае папулярызаваць кнігу, паказвае яе значнасць.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі адзначана *Мілавідская сельская бібліятэка дзяржаўнай*

*установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці* за плённую працу па фарміраванні экалагічнай культуры падрастаючага пакалення, прыцягненне ўвагі чытачоў да экалагічных праблем сваёй малой радзімы і стварэнне інфармацыйнай прадукцыі. З гэтай нагоды быў рапрацаваны праект «Экология природы – экология души» (2021).

У намінацыю **«За пошукавую і даследчую працу»** на разгляд журы былі прадстаўлены 10 работ.

Дыпломам першай ступені сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначана *дзяржаўная ўстанова культуры «Іўеўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за пошукавую і даследчую дзейнасць па зборы, захаванні, сістэматызацыі, афармленні і папулярызацыі матэрыялаў краязнаўчага характару пра Ільдэфонса Бобіча – былога ксяндза Іўеўскага касцёла святых апосталаў Пятра і Паўла, святара, доктара філасофіі, празаіка, публіцыста, перакладчыка – асобу, значную не толькі ў маштабах гістарычнага і літаратурнага краязнаўства, але і наогул нацыянальнай гісторыі і літаратуры.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана *Жытамлянская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр» Гродзенскай вобласці* за пошукавую і даследчую працу па вывучэнні роднага краю і стварэнні віртуальнага інфармацыйна-краязнаўчага даведніка «Жытомля: паміж былым і будучым» (http://rcbs.by/жытомля).

У намінацыю **«За падтрымку і развіццё чытання»** бібліятэкамі былі дасланы 8 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла *дзяржаўная ўстанова культуры «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» Мінскай вобласці* за распрацоўку і рэалізацыю адукацыйна-творчага праекта «Чытай-Валяй», аўтарскага медыяпраекта «Казкі на канапе» і літаратурна-этнаграфічнай экспазіцыі «Бабуліна спадчына».

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк стала *Міхалішкаўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Астравецкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за выхаванне любові да кнігі, мэтанакіраваную працу па папулярызацыі чытання сярод розных груп насельніцтва. На працягу апошніх трох гадоў бібліятэка рэалізавала два праекты: «Чытаем супольна» (2019–2020) і «Кніга і чытанне – для кожнага» (2021).

У намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** бібліятэкамі былі прадстаўлены 7 работ.

На першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк намінавана *бібліятэка-філіял № 2 імя І. Шамякіна ўстановы культуры «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва»* за распрацоўку новай канцэпцыі віртуальнага музейнага пакоя, прысвечанага вядомаму беларускаму пісьменніку Івану Шамякіну (http://gb2.mogilev.by/virtualny-muzejny-pakoj-ivan-shamyakin-talent-nepaduladny-chasu), выкарыстанне сучасных інфармацыйных сэрвісаў і тэхналогій, інфаграфікі.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначаны *філіял «Нацкая сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Воранаўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за інавацыйнасць падыходаў у абслугоўванні чытачоў, выкарыстанне не толькі традыцыйных форм дакументаў, але і сучасных носьбітаў інфармацыі, доступ у глабальную інфармацыйную прастору, неардынарнасць масавай работы і крэатыўнасць падыходаў да кожнага мерапрыемства. У аснову цікавага і перспектыўнага напрамку дзейнасці бібліятэкі – турыстычнага краязнаўства – пакладзены краязнаўчы праект «Адкрывай свой родны край», падчас рэалізацыі якога бібліятэкарам у практыку работы ўведзены тэхнічныя і сэрвісныя навацыі.

Конкурс завершаны, вынікі падведзены і мы спадзяёмся, што ўдзельнікі наступнага XXXI Рэспубліканскага конкурсу ўразяць журы яшчэ больш актуальнымі, змястоўнымі і якасна аформленымі працамі, напоўненымі цікавымі і ўнікальнымі праектамі і праграмамі, якаснымі электроннымі рэсурсамі ўласнай генерацыі і мультымедыйнымі дадаткамі, інфармацыйнай і рэкламнай прадукцыяй, фотаздымкамі і каляровымі малюнкамі па фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, прапаганды нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры.

Summary

The article summarizes the XXX Republican contest “Library is space national culture”.